**Хлопец марыў пра службу** / падрыхт. Г. Капшуль // Веснік Глыбоччыны. – 2016. – 13 лют. – С. 4.

# ХЛОПЕЦ МАРЫЎ ПРА СЛУЖБУ

Пётр вырас у вялікай шматдзетнай сям'і. Зайздросціў сваім старэйшым братам, якія праходзілі вайсковую службу: адзін – у Венгрыі, другі – у Калінінградзе, а трэці – у Германіі. З захапленнем слухаў іх армейскія расказы і марыў пра тое, што і сам праз нейкі час будзе дзяліцца ўспамінамі.

– Я не мог дачакацца, калі ж гэты момант настане, – гаворыць Пётр. – І вось надышоў май 87-га. Той самы май, які квеценню садоў і маршам «Славянкі» «праводзіў» мяне ў дарослае жыццё. Ганарыўся, выхваляўся перад сябрамі, што буду служыць у марфлоце. Маўляў, гэта вам не сухапутныя войскі. Свет убачу, будзе пра што ўспомніць. Толькі не суджана, відаць, таму было збыцца. З марфлотаўскай каманды мяне і яшчэ аднаго хлопца адправілі ў вучэбны цэнтр Самарканда. Мы не ведалі, як складзецца служба далей. Былі толькі здагадкі, і яны спраўдзіліся. Праз колькі часу нам сказалі, што будуць рыхтаваць на Афганістан. Не скажу, што гэта вельмі напалохала, але і радасці вялікай не прынесла. І тым не менш, трэба было служыць.

Кабул маладых салдат сустрэў стрэламі і ўзрывамі ў гарах, апраметнай цемрай і гарачым паветрам, якое і без таго цяжка было пераносіць. З гэтага для Пятра пачаліся новыя вайсковыя будні. Ратавала тое, што старэйшыя салдаты падтрымлівалі навабранцаў, не давалі пасці духам, дапамагалі, вучылі.

Рота аховы асобага аддзела, у якой нёс службу Пётр Маслякоў, заўсёды знаходзілася на перадавой. На васямнаццацігадовага юнака тым самым ускладвалася высокая адказнасць. Неаднойчы яму даводзілася суправаджаць розныя калоны, несці службу на кантрольна-прапускным пункце, выбіваць душманаў і губляць сяброў. Пётр Іванавіч не вельмі хоча пра гэта гаварыць. Маўляў, служба мёдам не здавалася. Кожнаму пакаленню выпадаюць свае выпрабаванні – галоўнае, прайсці іх годна.

Родныя ведалі, дзе служыць Пётр. Не ведалі толькі таго, што перажывае, як чакае «дэмбель» і не мае ўпэўненасці, што вернецца дамоў жывым, здаровым.

За два гады спужбы Пётр, як і яго сябры-саслужыўцы, з многім зміры́ліся, многае змянілася ў іх свядомасці. Вось толькі і рассказвае пра армейскія будні Пётр Іванавіч неахвотна.

***Старонку падрыхтавала***

**Ганна Капшуль**